Таким образом, демократическое государство является наиболее благоприятным для существования человека и развития общества и государства, так как наиболее соответствует природе человека и источнику его деятельности, которые были определены в трудах неофрейдистов.

**Источник**


1. *Адлер, А.* Практика и теория индивидуальной психологии / А. Адлер ; пер. с англ. А. Боковикова. — М. : Акад. проект, 2007. — 232 с.



***П. А. Чэлей***

*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В. М. Лянцэвіч*

*БДЭУ (Мінск)*


# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ ЗМЕНЫ Ў БССР У ПАЧАТКОВЫ ПЕРЫЯД ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

23 жніўня 1939 г. паміж нацысцкай Германіяй і СССР быў падпісаны Дагавор аб ненападзе, у сакрэтным дадатку да каторага абодва бакі прызналі літоўскі інтарэс да Вільні. 3 кастрычніка, калі міністр замежных спраў Літвы Юозас Урбшыс прыбыў у Маскву, Іосіф Сталін праінфармаваў яго аб савецка-германскіх сакрэтных пратаколах і паказаў карты сфер уплыву. Ад Літвы патрабавалася падпісаць тры асобныя дамовы, паводле якіх на яе тэрыторыі будуць размешчаны савецкія вайсковыя базы, а таксама да 50 000 савецкіх салдат; літоўская тэрыторыя на захад ад ракі Шэшупе будзе перададзена нацысцкай Германіі; адна частка віленскага краю, уключаючы Вільню, будзе далучана да Літвы [1]. Урбшыс пратэставаў супраць савецкіх баз, сцвярджаючы, што гэта будзе азначаць фактычную акупацыю Літвы. Немэтазгоднасць набыцця Вільні за такую цану была відавочнай. Наступныя перамовы пастаянна перарываліся, літоўцы прапаноўвалі альтэрнатывы. Сталін аказваў дадатковы ціск на літоўскі бок.

10 кастрычніка 1939 г. падпісаннем дамовы аб перадачы Літве горада Вільні і прылеглых зямель пачаўся падзел тэрыторый, занятых Чырвонай Арміяй падчас паходу ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь. 2 лістапада 1939 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон, згодна з якім Вярхоўныя Саветы БССР і УССР павінны былі прадставіць праекты размежавання заходніх раенаў і абласцей паміж рэспублікамі [2, с. 90]. Украінскае кіраўніцтва прапаноўвала правесці новую мяжу паміж БССР і УССР «значна паўночней натуральнай агульнапрынятай этнаграфічнай мяжы» [3, с. 127]. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, пазнаеміўшыся з дасланым з Кіева праектам, даў указанне падрыхтаваць свае абгрунтаванні і прапановы. Ключавую ролю адыграў гісторык, першы рэктар БДУ У. І. Пічэта. Менавіта копія артыкула Пічэты «Да пытання

аб паўднёвай мяжы БССР» была даслана 20 лістапада 1939 г. на імя сакратара ЦК УКП(б) Г. М. Малянкова. Галоўны сэнс гэтай запіскі заключаўся ў доказе беларускага характару раена і крытыцы асноўных довадаў украінскага боку. Канчатковае рашэнне было прынята 22 лістапада 1939 г. Сталін падтрымаў беларускі праект з некаторымі зменамі «у адпаведнасці з жаданнем украінцаў атрымаць трохі лесу» [3, с. 130]. Тэрыторыя Заходняй Беларусі, якая адыходзіла да БССР, у выніку гэтага скарацілася на 7839,7 км$^2$ за кошт перадачы ў склад УССР Камень-Кашырскага павета з цэнтрам і большай яго часткай, а таксама некаторых населеных пунктаў Кобрынскага, Драгічынскага, Пінскага і Столінскага паветаў [4, с. 6, 60, 223, 227, 229, 231, 235].

Тэрытарыяльныя змены для Беларусі ў пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны былі абумоўлены палітычнымі падзеямі таго часу. Важна адзначыць, што рашэнні прымаліся цэнтралізавана ў Маскве. Меркаванне беларусаў значна прайгравала перад амбіцыямі Сталіна. З пункту гледжання беларускага нацыянальнага руху Вільня мела асаблівае значэнне, бо ў мінулым была важным культурным і палітычным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага, у якім беларусы складалі значную частку насельніцтва. Менавіта таму перадача Вільні Літве дагэтуль актыўна крытыкуецца.

**Крыніцы**

1. Договор о передаче Литовской Республике города Вильно и Виленской области и о взаимопомощи между Советским Союзом и Литвой 10 октября 1939 г. // Известия. — 1939. — 11 окт. АВП СССР, ф. За — Литва, д. 55.

2. Административно-территориальное устройство БССР : справ. : в 2 т. / Глав. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т философии и права Акад. наук БССР ; редкол.: В. А. Круталевич [и др.]. — Минск : Беларусь, 1985–1987. — Т. 1 (1917–1941 гг.) / сост.: Т. А. Воробьева [и др.]. — 1985. — 390 с.

3. *Куманев, Г. А.* Рядом со Сталиным / Г. А. Куманев. — Смоленск : Русич, 2001. — 528 с.

4. Назаўседы разам: Да 60-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР / пад рэд. М. П. Касцюка [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1999. — 256 с.

***Б. П. Швед***
*Научный руководитель — кандидат исторических наук О. М. Ленцевич*
*БГЭУ (Минск)*

## ТЕОРИЯ СДЕЛКИ ФРИДРИХА КАРЛА ФОН САВИНЬИ

Проблема несоответствия воли и волеизъявления в сделках является актуальной для современного права. Важность изучаемой темы определяется возможностью обеспечения взаимного уважения интересов сторон, их равноправия и свободы воли в процессе заключения сделок.